Сямейная газета

Выпуск № 14 (173)

# СТО ЗАГАДАК, ці Урок выжывання стомленай маці

*Дзень быў цяжкі і не толькі з-за спякоты. Так атрымалася, што мне неабходна было праехаць больш за сто кіламетраў з вёскі дадому, у Мінск, бо з летняга лагера вярталася дзесяцігадовая Уля. Яе трэба было забраць увечары з Усходняга вакзала, і гэта павінна была зрабіць я з пяцігадовай Меланняй на руках. Па прыездзе ў горад я ўжо адчувала сябе абяссіленай. Зрабіла дома ліманад і не дачакаўшыся, пакуль той астыне, паехала па дачку. Ехалі на маршрутцы, у якой з-за гарачыні малая стала капрызіць. Я ўсё больш нервавалася, але мы своечасова з'явіліся на месцы. Назад вырашылі выклікаць таксі. Але як на тое, таксіст доўга не мог знайсці нас на стаянцы, і мы вымушаныя былі з сумкамі ісці да прыпынку. Толькі ў машыне, дзе працаваў кандыцыянер, я перастала гаварыць Ульяне «пачакай» у адказ на ўсе пытанні.*

*— Мама, уяві, у цябе ёсць тры дарогі. Адна — з непраходнымі шыпамі, другая — з лятучымі мышамі, а трэцяя — з павукамі. Вось якую лепш абраць? Ну мааам, гэта ж адразу зразумела, што з павукамі, яны ж разбягуцца! Давай згуляем у «селі-ўсталі», ну вось, рукі злучы ў замочак, цяпер уверх пальцы, потым уніз! Ды што ж такое! Няправільна! Давай спачатку.*

*— Але я раблю, як ты кажаш!*

*— Ты павінна была войкнуць ад болю, калі я сціскаю табе рукі, а ты маўчыш! Значыць, няправільна. О! Пад дрэвам сядзяць чатыры львы, адзін сышоў, колькі засталося?*

*— Два! — весела выкрыквае Меланія*

*— Няправільна! Тры! — задаволена выводзіць Уля.*

*— Па небе ляціць самалёт, у ім пяцьсот цаглін, адна выпала — засталося?*

*— Чатырыста дзевяноста дзевяць, — адказваю я.*

*— А тады ад чаго загінула бабуля?*

*— Якая бабуля?*

*Уля залівіста смяецца.*

*— На яе ж цагліна ўпала з самалёта! Ведаеш, я ў лагеры, як ты, адказала! А як змясціць слана ў халадзільнік за тры дзеянні?*

*— Адчыніў халадзільнік, змясціў слана, зачыніў!*

*— Малайчына, мама! А тады паспрабуй змясціць у халадзільнік за чатыры дзеянні жырафа.*

*Тут жа не вытрымліваე.*

*— Якая ты нездагадлівая! Трэба адкрыць халадзільнік, дастаць слана, пакласці жырафа і закрыць! У льва сёння дзень нараджэння, хто да яго не прыйдзе?*

*— Мабыць, тыя, каго ён можа з'есці...*

*— Жыраф не прыйдзе! Жы-ра-ф! Ты ж яго ў халадзільніку зачыніла.*

*Кіроўца засмяяўся ўголас. Усю дарогу ён спрабаваў мне нешта сказаць, але і слова ўставіць не змог з-за Улькіных загадак. Малая адчула няёмкасць і змоўкла. Калі кіроўца супакоіўся, то ўдакладніў, да якога пад'езда нас падвезці. У гэты час Уля расслабілася.*

*— Мам, мне яшчэ загадак СТО трэба табе загадаць, бо я ж потым проста забудуся.*

*Кіроўца ў гэты час спыняе машыну паблізу нашага дома. Пачынаецца нейкая мітусня: Меланія хоча паказаць Улі свой кашалёчак і адтуль вывальваюцца манеткі, яны разам спрабуюць іх сабраць, тут жа ў Улі выпадае з кішэні тэлефон і захрасае паміж аўтамабільнымі крэсламі. Я з цяжкасцю выцягваю Меланню з машыны і стаўлю на тратуар. Уля працягвае поўзаць у машыне і спрабуе дастаць тэлефон. Кіроўца ставіць каля мяне сумкі.*

*— Я хацеў папрасіць прабачэння, што не змог вас знайсці на вакзале, — кажа спачувальна. — Цяпер разумею, як цяжка было ісці да прыпынку з сумкамі і дзецьмі. А вам яшчэ сто загадак адгадваць...*

*Прызнацца, я на секунду запанікавала. Раптам заўважыла дзяцей у двары — сяброўак дачкі!*

*Энергічна махаю дзяўчынкам рукой, і тыя натоўпам бягуць да мяне. Урачыста аб'яўляю ім, што Уля прыехала! Малая, вылазячы з машыны, не паспявае адказваць на пытанні сяброўак.*

*— Улька, табе ж яшчэ сто загадак загадваць, — кажу я, падымаючы сумку.*

*— А можна мне пакуль дзяўчынкам іх загадаць, а табе іншым разам? Ну, калі ласка, калі ласка, калі ласка...*

*— Добра, толькі як прыйдзеш дадому, адразу мыцца і спаць! — ужо амаль наўздагон крычу дачцэ. — Табе яшчэ адпачыць трэба.*

*Раптам лаўлю захоплены позірк кіроўцы:*

*— Пашанцавала?*

*— Не-а! Доўгія гады трэніровак і прыроджанае ўменне выжываць.*

*Смяёмся. Я накіроўваюся з Меланняй дадому піць астылы ліманад.*

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Тыя, хто побач

# МЯДЗВЕДЗЬ І ЯГО НАШЧАДКІ



**Не раз і не два ў жыцці даводзілася яму чуць старую прыказку «Цярпі, казак, атаманам будзеш» і пераконвацца ў яе вечнай мудрасці. Самы, напэўна, славуты беларускі спартсмен Аляксандр Мядзведзь выходзіў на кожны бой, як на апошні, і сышоў з дывана непераможаным на Алімпіядзе-1972. Там, у Мюнхене, вялікаму атлету, афіцыйна прызнанаму найлепшым «вольнікам» XX стагоддзя, удалося зрабіць тое, што да яго не ўдавалася ніводнаму барцу — стаць трохразовым алімпійскім чэмпіёнам.**

З ім з задавальненнем знаёміліся і, што называецца, на роўных кантактавалі шматлікія выдатныя сучаснікі, уключаючы Пятра Машэрава, Юрыя Гагарына, Роберта Раждзественскага, Ігара Лучанка, Аляксандру Пахмутаву, Ігара Дабранравава, Фідэля Кастра і іншых знакамітых людзей. Уладальнік трох залатых алімпійскіх медалёў, шматразовы чэмпіён Еўропы і свету, ардэнаносец, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Аляксандр Мядзведзь многага дасягнуў на трэнерскай ніве, быў у свой час віцэ-прэзідэнтам НАК і старшынёй федэрацыі барацьбы Рэспублікі Беларусь.

Паказальна, што на час правядзення летняй Алімпіяды-2012 у Лондане адну са станцый падземкі ў метрапалітэне англійскай сталіцы перайменавалі ў гонар Аляксандра Васілевіча. У сваю чаргу, у Мінску, ганаровым грамадзянінам якога шмат гадоў з'яўляецца славуты атлет, на вуліцы Каліноўскага адкрыта барцоўская школа імя А. В. Мядзведзя, рэгулярна праводзіцца ўжо міжнародны турнір серыі Гран-пры на прызы нашага славутага суайчынніка.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

Рыхтуемся да вяселля

# ЦІЛІ-ЦІЛІ ЦЕСТА...

## Колькі сёння каштуе стварэнне новай сям'і?

**Сезон вяселляў у разгары. Дзень шлюбу, безумоўна, павінен запомніцца на ўсё жыццё. Скарыстайцеся нашымі парадамі, каб усё прайшло ідэальна.**

### Каб касцюмчык «сядзеў»

Галоўны трэнд вясельнай моды-2021 — сілуэт «русалка»: карункавая сукенка з кароткім або доўгім рукавом і абавязкова з дэкальтэ. Глыбокае дэкальтэ — ключавая дэталь гэтага вясельнага сезона. Але наогул вясельная мода кансерватыўная, і важней, чым трапіць у трэнд, тут уменне правільна стварыць вобраз, зыходзячы з нюансаў знешнасці нявесты.

Класічная беласнежная сукенка падыдзе вельмі нямногім дзяўчатам: яе можа дазволіць сабе толькі зімовы колератып (светлая скура і свежы далікатна-ружовы румянец). Астатнім лепш спыніцца на адценнях белага. Дзяўчатам з цёплым падтонам скуры, смуглявым ад прыроды, а таксама аматарам сонечных працэдур або салярыя лепш абраць крэмавае, персікавае адценні, колер сланавай косці або шампанскага. Брунеткі можна падабраць халодны пастэльны фіялетава-ружовы. Дзяўчатам з рудымі і залацістымі валасамі асабліва процілаказаны класічны халодны белы колер — лепш спыніцца на адценнях белага цёплага спектра.

У гэтым вясельным сезоне пануе талія — яе падкрэсліваюць самыя актуальныя мадэлі шлюбных сукенак. Вышэйзгаданы сілуэт «русалка», дзе спадніца плаўна пашыраецца ад каленяў, будзе добра выглядаць толькі на нявестах з класічнай фігурай «пясочны гадзіннік» і тонкай таліяй. Сілуэт «прынцэса» (вузкі верх і вельмі пышная спадніца) таксама патрабуе таліі, затое дазволіць схаваць занадта пышныя клубы.

А-падобны сілуэт — гарсэт і ўмерана пышная спадніца — гэта класіка. Асабліва дарэчны такі сілуэт для мініяцюрных дзяўчат, але падыдзе і «плотным» нявестам: дапаможа схаваць непатрэбныя аб'ёмы, дадаўшы вобразу далікатнасці. Поўнасцю вузкі сілуэт спадніцы падыдзе ўладальніцам хударлявай фігуры, ён будзе выглядаць прыгожа на высокіх дзяўчынах. Стыль «ампір» характарызуецца завышанай таліяй і пойдзе нявестам, якія чакаюць дзіця.

Даўжыня сукенкі залежыць ад стройнасці ног, аднак большасць нявест аддае перавагу сукенкам «у падлогу». Шлейф выглядае велічна і па-жаноцку, але ў такой сукенцы рухацца можна толькі па плаўных лініях, пазбягаючы рэзкіх паваротаў, каб не заблытацца.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «СГ».)*

